среднем на расстояние 40,7 км) данные процентные соотношения намного хуже: 0–15 лет — 5,1 %, 16–60 лет — 17,7 %, старше 60 лет — 77,2 %.

Как видим, масштабы сокращения числа сельских поселений и численности жителей в них в районе впечатляющие. Сохранение сложившихся тенденций в ближайшей перспективе может привести к утере значительной части сельского поселенческого потенциала. В ходе реализации Государственной программы возрождения и развития села, в 2005г. в Горецком районе было построено 3 агрогородка в деревнях Паршино (РУП «Учхоз БГСХА»), Каменка (СПК «Каменская Нива») и Овсянка (СПК «Овсянка»). В этих сельских поселениях, численность трудоспособного населения не только не уменьшилась, но, даже несколько возросла. Так, например, в далеко не лучшем хозяйстве СПК «Каменская Нива» численность механизаторских кадров возросла с 16 чел. в 2004 г. до 21 чел. в 2005 г. (+ 30,3 % к 2004 г.), и обеспеченность механизаторами в этом хозяйстве составила 91,3 % от потребности, увеличилась также, хотя и не столь значительно, доля механизаторов, имеющих классность (+12,3 %), а также доля механизаторов до 30 лет (+11,5 %). Однако, на территории этого же хозяйства за 2005 г. из 8 сельских населенных пунктов, в 6 продолжаются процессы уменьшения сельского населения, а в 4 не осталось жителей моложе трудоспособного возраста.

Обобщая анализ приведенных данных, следует подчеркнуть, что реализация комплекса мероприятий, предусмотренных Государственной программой возрождения и развития села по улучшению социальных условий, а также расширению транспортной доступности для сельских жителей является важной предпосылкой закрепления рабочей силы в сельском хозяйстве. Создание в районе 12 агрогородков, увеличение доходов сельчан, приближение их социальной и бытовой инфраструктуры к городским показателям, согласно вышеупомянутой программе, будет содействовать уменьшению оттока сельских жителей, в особенности населения трудоспособного возраста.

# САЦЫЯЛЬНЫЯ ПАВОДЗІНЫ СЯЛЯНСТВА БЕЛАРУСІ НА ПЕРАХОДНЫМ ЭТАПЕ ЎСТАЛЯВАННЯ НОВАГА ЛАДУ (сакавік-май 1917 г.)

**І.М. Рыжанкоў**

Вядома, што ў ліку прычын масавых выступленняў працоўных Петраграда 23–24 лютага 1917 г. з'яўлялася рэзкае пагаршэнне іх прадуктовага забеспячэння. Невыпадкова, што ў ходзе рэвалюцыі і пасля яе менавіта гэтая праблема з'яўлялася найбольш актуальнай у шэрагу іншых, якія давялося вырашаць Часоваму камітэту Дзяржаўнай думы, а затым і новаму кабінету міністраў.

Перамена ўлады, якая адбылася ва ўмовах ваеннага часу, уяўляла, акрамя іншага, пагрозу функцыянаванню сістэмы забеспячэння горада і фронта харчовымі і іншымі прадуктамі, таму існаваўшыя на Беларусі штабы ваеннага камандавання, органы самакіравання, камітэты грамадскіх арганізацый і інш. сваю першачарговую задачу бачылі ў захаванні парадку і стабільнасці ва ўсіх сферах жыццядзейнасці мясцовага насельніцтва. Асобы клопат у гэтым сэнсе выклікалі сяляне. Так, ужо 4 сакавіка на адрас віцебскага губернатара паступіла сакрэтнае данясенне ад себежскага іспраўніка аб вяртанні апошнім часам з Петраграда «многіх сялян, якія, перадаючы самыя процілеглыя звесткі аб падзеях, унеслі ў асяроддзе насельніцтва трывогу і выклікалі ў ім недавер да ўлады, і з-за гэтай акалічнасці выканаць распараджэнне аб дастаўцы падвод і рабочых у цяперашні час няма ніякай магчымасці» [17, арк. 125 адв.]. Невыпадкова, менавіта ў Віцебскай губ., у сакавіку мелі месца «выпадкі захопу сялянамі панскіх зямель, лясоў і арышты памешчыкаў» [13, арк. 74]. Назіраліся яны і ў Рагачоўскім і Мінскім паветах.

Такім чынам, у асобных раенах выявілася тэндэнцыя да выкарыстання сялянамі рэвалюцыйных падзей у сваіх карыслівых мэтах. Для прадухілення шырокага захопнага руху



Репозиторий БГАТУ

ім належала растлумачыць небяспеку ўсялякіх правапарушэнняў для дзяржавы і грамадства ва ўмовах вайны, пераканаць у легітымнасці і прагрэсіўнасці новай улады. З гэтай нагоды намаганнямі ўрадавых камісараў, работнікаў земскіх устаноў, служачых паліцыі, інтэлігенцыі і інш. былі скліканы сельскія сходы, на якіх абвяшчаўся змест Маніфестаў, Дэкларацыі Часовага ўрада ад 3 сакавіка і яго загадаў, пастаноў, адозваў і інш.

Каардынуючую працу па тлумачэнні сялянству сутнасці падзей узялі на сябе губернскія земскія ўправы. Так, старшыня віцебскай управы М.Л. Карташоў, назначаны губернскім камісарам, у звароце ад 9 сакавіка да «сельскага насельніцтва» тлумачыў што трэба рабіць, каб умацаваць новы парадак, у тым ліку «абараніцца ад злых людзей» і забяспечыць «упэўненасць кожнага, што ніхто не зробіць замах на яго ці на яго маемасць», «не слухаць падбухторшчыкаў супраць новага ўрада, а дапамагаць яму...» [15, арк. 108]. Старшыня Мінскага губернскага земства Б.М. Самойленка з першых дзен свайго знаходжання на пасадзе губернскага камісара трымаў пад асабістым кантролем ход гэтай працы. Акрамя таго, на сходзе служачых і рабочых Мінскага камітэта Усерасійскага земскага саюза было прызнана неабходным правесці шэраг мер па прапагандзе «дзяржаўнага перавароту» сярод сялянства, бо «пераважная большасць іх знаходзіцца або ў поўным няведанні аб адбыўшымся палітычным пераломе або ўяўляе яго ў вельмі невыразным і арыгінальным выглядзе» [13, арк. л. 55]. Магілеўскі губернскі камісар Ф.Я. Хамянтоўскі, на папярэдняй пасадзе — старшыня губернскай земскай управы, у сваім цыркуляры да павятовых камісараў праводзіў думку аб тым, што падзенне старога ладу не павінна выклікаць «парушэння законнасці і парадку» [15, арк. 209].

Акрамя ўрадавых і грамадскіх сіл, задача правядзення тлумачальнай працы сярод вяскоўцаў ускладалася і на царкву. На пачатку сакавіка кіраўнікі праваслаўнай, каталіцкай і іншых канфесій Беларусі звярнуліся да святароў і вернікаў з заклікам падтрымаць новы дзяржаўны лад. Так, 4 сакавіка ўпраўляючы Магілеўскай Архіепархіей епіскап І. Цэпляк, разаслаў цыркуляр мясцоваму рымска-каталіцкаму духавенству аб правядзенні «ўрачыстага набажэнства» з нагоды перамогі рэвалюцыі і ў гонар «Часовага ўрада, прызнанага адзінадушна ўсей краінай» [12, арк. 4]. Праваслаўныя іерархі таксама ўдзельнічалі ў ганаровых набажэнствах. З гэтай нагоды 6 сакавіка ў Мінску каля Кафедральнага сабора адбыліся ўрачыстая служба і Крыжовы ход. У сваей прамове Епіскап Слуцкі Феафілакт, акрамя іншага «заклікаў усіх да спакойнага стаўлення да таго, што здзейснілася, і да пакорлівасці новаму ўраду» [21]. Пазней, на пастырскім сходзе духавенства г. Мінска было прызнана неабходным «укараняць у свядомасць сваей паствы думку аб поўным даверы і паслухмянасці Часоваму ўраду...падаўляць успышкі ўсялякай нацыянальнай і рэлігійнай варожасці» [20]. Для азнаямлення вернікаў Полацкай епархіі было надрукавана 366 экз. Маніфеста Мікалая ІІ аб адрачэнні ад трона [14, арк. 12–12 адв.]. Часам, па прычыне таго, што «царкоўныя іерархі не разаслалі святарам распараджэння аб спыненні малітвы за цара» [13, арк. 42], у шэрагу месцаў (веска Азярцы, Аршанскага, веска Вяляцічы Барысаўскага пав. і інш.) адпаведныя набажэнствы працягваліся. Але ў цэлым касцел і царква заявілі сябе прыхільнікамі Часовага ўрада і заклікалі да таго ж сваю паству.

Факт адрачэння Мікалая ІІ ад трона ўспрымаўся сялянствам неаднолькава, але ў большасці стрымана, без выразных эмоцый. Пра «ашаламлены стан» сялянскай грамады паведамляў у віцебскі земскі дзеяч У. Карпаў. Так, пачуўшы аб скасаванні манархіі, сяляне Гарадоцкага пав. выказвалі заклапочанасць: «а ці не будзе горш без цара?» [19, арк. 41]. Сяляне Манастыршчынскай вол., Мсціслаўскага пав. адгукнуліся на адрачэнне наступным чынам: «зноў гэтыя самакрады на царабацюхну напалі. Дабяруцца хутка і да нас» [4]. На думку сялян Рагачоўскага пав., «усе гэта зрабілі паны, каб вярнуць прыгоннае права» [11, л. 7–8]. Сяляне в. Вяляцічы, Барысаўскага пав. непакоіліся з-за таго, што «зямнога Бога зверглі» і можа з'явіцца Антыхрыст [10, арк. 23]. З другога боку, першая рэакцыя жыхароў с. Новае, Полацкага пав. на паведамленне аб адрачэнні цара адбілася ў словах: «Так і трэба. Даўно пара!» [2]. Сяляне Пакоцкай вол., Гомельскага пав. даведаўшыся ў канцы сакавіка аб пераварoце, былі «несумненна вельмі задаволены тым, што здарылася» [6].

Аб станоўчых настроях сялянства адносна перамены ўлады пераканаўча сведчылі паведамленні асоб, адказных за скліканне валасных сходаў. Так, 17 сакавіка дзвінскі камісар



Рэпазіторый БГАТУ

Бацяноўскі паведамляў пра адсутнасць эксцэсаў і гатоўнасць насельніцтва дапамагаць уладам [15, арк. 109]. 12 сакавіка бабруйскі камісар Варанцоў-Вельямінаў паведамляў, што «ў павеце падзеі зразуметы правільна» і перамена ўлады адбылася «без эксцэсаў» [1].

Варта заўважыць, што на этапе, калі стары лад перастаў існаваць, а новы толькі ўсталёўваўся, сяляне не заклікаліся да актыўных дзеянняў: ад іх патрабавалася толькі выкананне ранейшых абавязкаў. У Слуцкім пав. земскі начальнік Саракаумаў асабіста на сельскіх сходах аб'явіў сялянам тэкст маніфестаў і заклікаў «захоўваць строгі парадак і спакойна, стваральна і энергічна працаваць на карысць нашай слаўнай арміі» [1]. Пры гэтым заклікі ў падтрымку Часовага ўрада непарыўна звязваліся з ідэяй абавязковага працягу вайны і неабходнасцю дапамогі фронту [9, арк. 23–24].

Як вынікала са зместу Маніфестаў, іншых публікацый, прамоў аратараў, пытанне аб лесе манархіі адкладвалася да вырашэння яго Устаноўчым сходам [18, арк. 108]. Да таго ж новы кабінет міністраў, названы Часовым урадам, на-бываў легітымную ўладу з рук былога цара. Але можна меркаваць, што ў сваей працы па тлумачэнні сутнасці падзей на весцы агітатары і службовыя асобы не акцэнтавалі ўвагі на юрыдычных нюансах, а пераконвалі сялян у законнасці ладу, што ўсталяваўся ў імперыі, і заклікалі да яго падтрымкі. У поўнай меры гэта датычыла далекіх ад палітыкі «грамадзян-земляробаў», увага і энергія якіх скіроўвалася на неабходнасць неадкладнага забеспячэння арміі і гарадскога насельніцтва «збожжам, мукой, крупой і іншымі прадуктамі» [16, арк. 18], на атрыманне «ўраджаю, дастатковага для пракармлення войскаў» [15, арк. 108].

Вынікі гэтай працы рабіліся больш адчувальнымі па меры актывізацыі на весцы агітацыі і прапаганды, найперш, сіламі дзяржаўных устаноў. Працэс азнаямлення сялян з рэвалюцыйнымі падзеямі быў запаволены малалікасцю агітацыйных сіл, а таксама вясенннім бездарожжам, таму ў сакавіку яшчэ не ўсе сялянства даведалася аб перамене ўлады. Як правіла, у ліку першых апынуліся жыхары тых весак, якія знаходзіліся паблізу ад гарадоў, лініі фронту, чыгуначных вузлоў, сухапутных і водных камунікацый. Толькі да Пасхі (канец красавіка), калі адбываліся масавыя святочныя набажэнствы ў мястэчковых і гарадскіх храмах, калі актывізавалася дзейнасць грамадскіх арганізацый (Саветаў, прафсаюзаў, камітэтаў) і дэмакратызаваных земстваў, толькі тады ўзніклі ўмовы для грунтоўнага азнаямлення вяскоўцаў з падзеямі ў сталіцы, «заваяванымі свабодамі», праграмай Часовага ўрада і інш. У прыватнасці, як паведамляла эсэраўскае выданне «Земля и воля», сяляне вёскі Харэвічы, Мінскага пав. даведаліся аб рэвалюцыйных падзеях у другой палове красавіка — на маніфестацыях, мітынгах, чытаннях, якія ладзілі пад Пасху настаўнікі, салдаты, студэнты і семінарысты, што вярнуліся з Петраграда, Масквы і іншых гарадоў [3]. Пэўнае ўздзеянне на настроі і паводзіны вяскоўцаў аказала святкаванне 1 мая, калі ў рознага кшталту мерапрыемствах — мітынгах, шэсцях, дабрачынных акцыях — бралі ўдзел і сяляне.

Пад час рэарганізацыі земстваў і ўтварэння органаў улады (валасных камітэтаў) стаўленне сялян да рэвалюцыйных падзей рабілася ўсе больш асэнсаваным. У прыватнасці, Мікулінскі валасны сход Аршанскага пав. пасля выбараў «службовых асоб часовага самакіравання» вітаў Часовы ўрад, выказаў «энергічную падтрымку яго добрым пачынанням на карысць дарагой Радзімы» [5, арк. 14]. Аб поўнай падтрымцы ўрадавай палітыкі «давесці вайну да пераможнага канца і перабудовы радзімы на новых пачатках, якія выпрацуе Устаноўчы сход» — пастанавілі на ўрачыстым сходзе грамадзяне Хлыстоўскай вол [5, арк. 50]. Сваю прысягу на вернасць Часоваму ўраду і «доблеснай арміі і флоту» даслалі грамадзяне сяла Сяроўкі, Гомельскага пав [5, арк. 8].

Такім чынам, на Беларусі, як і паўсюдна па краіне, адбывалася ўсталяванне так званага «новага ладу», а па сутнасці — фарміраванне новай палітычнай сістэмы. Як правіла, арганізатарамі выступілі былыя чыноўнікі дзяржаўнага апарату (акрамя губернатараў і іх намеснікаў, а таксама жандараў, інстытуты якіх былі скасаваны), служачыя земстваў, гарадскіх самакіраванняў, Усерасійскага земскага саюза, Усерасійскага саюза гарадоў, члены Камітэтаў грамадскай бяспекі, Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў, прадстаўнікі інтэлігенцыі і інш. Знешне роля і месца сялянства ў гэтым працэсе былі невыразнымі, але ў плане стварэння сацыяльнай апоры і вырашэння вострай харчовай праблемы яго значнасць узрастала да першых велічынь. Невыпадкова ў сакавіку сацыяльныя паводзіны сялянства,



Рэпазіторый БГАТУ

нараўне з дэмакратызацыяй арміі, выклікалі павышаную грамадскую цікавасць. Пры гэтым прэса імкнулася пераканаць грамадскасць у прыхільным стаўленні сялянства да новага ладу. Відавочна, што падобныя публікацыі выконвалі не толькі інфармацыйную функцыю, але і выконвалі прапагандысцкую задачу, скіраваную на кансалідацыю грамадскасці ў вырашэнні агульных мэтаў. У гэтым напрамку працавалі ўсе без выключэння органы друку. Асноўнае месца ў іх адводзілася шматлікім пастановам валасных сходаў аб падтрымцы новага ўрада, захаванні парадку, ахвяраваннях на карысць арміі, удзеле ў рэарганізацыі органаў самакіравання і інш. Як правіла, парушэнне грамадскага парадку звязваліся з дзейнасцю варожых новаму ладу сіл [7]. Але пра выпадкі рабаўніцтва яўрэйскіх лавак ці маемасці з удзелам сялян, да прыкладу, у Гадзілавічах, Рагачоўскага пав. [11, арк. 7–8] у адкрытым друку, як правіла, не паведамлялася.

Асноўная энергія агітацыйна-прапагандысцкай працы на весцы скіроўвалася, па-першае, на захаванне сялянамі ранейшага ладу жыцця і ранейшага выканання ўскладзеных на іх абавязкаў, звязаных з працоўным і харчовым забеспячэннем фронта і горада: па-другое, на прадухіленне стыхійнага аграрнага руху. Асноўнымі сродкамі дасягнення пастаўленых мэт з'яўляліся: публічнае абвяшчэнне апошніх царскіх маніфестаў і Дэкларацыі Часовага ўрада на вясковых і валасных сходах, у храмах пад час набажэнстваў; праз прэсу, адозвы, звароты рэлігійных дзеячаў і інш.

У працэсе прапаганды новага ладу і забеспячэння яго падтрымкі пераважалі мітынговыя формы працы з сялянамі, якія, як правіла, завяршаліся зацвяр джэннем рэзалюцый, прапанаваных арганізатарамі. Удзел саміх сялян у гэтых мерапрыемствах не вызначаўся прыкметнай актыўнасцю. Іх стаўленне да зверг нутага цара характарызавалася пераважна стрыманасцю, а да новай улады ў асобе Часовага ўрада — дабразычлівасцю і настроем аказваць яму падтрымку. Па вялікім рахунку, ужо ў сакавіку арганізатары новага ладу (губернскія і павятовыя камісарыяты, земствы, вясковая інтэлігенцыя, дэмакратычная грамадскасць) дамагліся сваей мэты. Асобныя проціпраўныя дзеянні сялян супраць чужой уласнасці былі выкліканы паслабленнем улады на пераходным этапе ўсталявання новага палітычнага рэжыму, але і яны не былі ўласцівы беларускай весцы. У параўнанні з Маскоўскай, Арлоўскай, Вяцкай і шэрагам іншых губерняў Расіі [8, арк. 374–375], на Беларусі праявы аграрнага руху адбыліся ў значна меншых памерах і мелі месца толькі ў 5 паветах [22, арк. 103].

**Літаратура:**


1. Вестник Минского губернского комиссара.— 1917.— 21 марта.
2. Революция в деревне // Речь.— 1917.— 15 марта.— С. 4.
3. Д. Харевичи Минская губерня // Земля и воля.— 1917.— 24 мая.— С. 2.
4. Деревня и новый строй // Воля народа.— 1917.— 2 июля.— С. 1.
5. Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі (далей ДАРФ). Фонд. 1778. Вопіс 1. Справа 143.
6. Известия Гомельского Совета рабочих и соладтских депутатов.— 1917.— 18 апреля.
7. Крестьяне и бывшая полиция // Минский голос.— 1917.— 16 марта.— С. 3.
8. Малявский, А.Д. Крестьянское движение в России в 1917 г. (март-октябрь) / А.Д. Малявский. — Москва : Наука, 1981.— 400 с.
9. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей НАРБ). Фонд 60. Вопіс 3. Справа 150.
10. НАРБ. Фонд 60. Вопіс 3. Справа 162.
11. НАРБ. Фонд 60. Вопіс 3. Справа 167.
12. НАРБ. Фонд 60. Вопіс 3. Справа 168.
13. НАРБ. Фонд 60. Вопіс 3. Справа 242.
14. НАРБ. Фонд 622. Вопіс 1. Справа 1.
15. НАРБ. Фонд 622. Вопіс 1. Справа 2.
16. НАРБ. Фонд 622. Вопіс 1. Справа 4.
17. НАРБ. Фонд 622. Вопіс 1. Справа 22.
18. НАРБ. Фонд 624. Вопіс 1. Справа 5.
19. НАРБ. Фонд 626. Вопіс 1. Справа 1.
20. Обращение пастырей // Вестник Минского губернского комиссара.— 1917.— 14 апреля.— С. 3.
21. Празднование свободы в Минске // Минские епархиальные ведомости.— 1917.— 15 марта.
22. 1917 г. в деревне (Воспоминания крестьян) / Ред. Я.Л. Яковлева. — Москва : Политиздат, 1967.— 268 с.




Репозиторий БГАТУ